# У ПОШУКАХ СТАБІЛЬНАГА «КВАДРАТА»


Фота БЕЛТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёлета запланавана толькі 3,5 млн «квадратаў», фінансаванне з боку дзяржавы разлічана на 375 тысяч квадратных метраў. Атрымліваецца, што для льготнікаў з дзяржпадтрымкаю будзе пабудавана жылля прыкладна ў 2,5 раза менш, чым летась.

***— А як будзе вырашацца праблема забеспячэння жыллём шматдзетных сем'яў?***

— Справа ў тым, што ў нас прыкладна 26 тысяч шматдзетных сем'яў, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. З іх каля 6,5 тысячы сям'яў стаяць на гэтым уліку больш за 3 гады.

Таму запланавана пабудаваць 4,3 тысячы кватэр для шматдзетных сем'яў, або 260 тысяч квадратных метраў жылля з дзяржпадтрымкай. Больш за тое, заўважу, што яны будуць будаваць сабе жыллё па ранейшых умовах, якія прапісаны ва Указе кіраўніка дзяржавы №13.

***— Цяпер урад спрабуе адшукаць дадатковыя рэсурсы для ажыўлення рынку будаўніцтва жылля...***

— Сёлета, напрыклад, на гэтыя мэты накіраваны так званыя паўільготныя крэдыты ад Белаграпрамбанка і Беларусбанка з адносна невысокімі для насельніцтва працэнтамі. Але грошай па такіх крэдытных лініях няшмат, і на масавага спажыўца яны не разлічаны. У першую чаргу такія крэдыты падтрымаюць чаргавікоў-«афганцаў» і іншых былых удзельнікаў ваенных дзеянняў на тэрыторыі замежных краін.

***— У найбліжэйшай будучыні будзе распрацаваны новы механізм фінансавання жыллёвага будаўніцтва з дзяржпадтрымкай. Чытачы нашай газеты хвалююцца, што для большай часткі чаргавікоў гэтую дапамогу проста могуць адмяніць...***

— Зараз спецыялістамі распрацоўваецца схема будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай, якая пачне дзейнічаць не раней за другую палову 2017 года. Заўважу, што сёння перад банкаўскай сістэмай з удзелам Мінфіна (размеркаванне бюджэту) пастаўлена задача адшукаць адпаведныя рэсурсы, каб і надалей захаваць льготныя ўмовы будаўніцтва жылля (у першую чаргу для шматдзетных) па аналогіі з ужо дзеючымі.

> **У краіне налічваецца прыкладна 26 тысяч шматдзетных сем'яў, якія стаяць на ўліку, з іх каля 6,5 тысячы — больш за 3 гады.**

***— Якім яшчэ катэгорыям чаргавікоў можна будзе разлічваць на адрасную дзяржпадтрымку па новай схеме?***

— У заканадаўстве прапісаны 15 катэгорый чаргавікоў, якія маюць права атрымліваць у той ці іншай ступені дзяржаўную падтрымку пры будаўніцтве жылля. Яны застануцца і надалей. Цяпер не ставіцца задача, каб кагосьці адтуль выкрасліць. Заўважу, што і цяпер дзяржаўная падтрымка прадастаўляецца ў нас цалкам адрасна. Агулам ільготныя крэдыты і цяпер ніхто не атрымлівае.

Сёння, напрыклад, шматдзетная сям'я плаціць па крэдыце пэўную суму і нават не ведае, колькі гэта жыллё рэальна каштуе дзяржаве. А па новай схеме чалавек будзе ўжо ведаць, на які аб'ём дапамогі ад дзяржавы ён можа разлічваць, які крэдыт атрымае і як з дапамогай грошай дзяржавы гэты крэдыт пагасіць. Чаргавік будзе бачыць усю фінансавую кухню свайго будаўніцтва. Напрыклад, кліент ужо будзе дакладна ведаць, як зменяцца ўмовы крэдытавання, калі ён унясе ў будаўніцтва пэўны аб'ём уласных грошай. Чалавеку стане вядомы менавіта яго персаніфікаваны рух фінансавых рэсурсаў. Вынік атрымаецца прыкладна такі ж, як і пры сённяшнім ільготным крэдытаванні (аб'ём крэдыту і працэнты па ім), а схема паступлення і руху грошай — іншая.

Навошта нам такая схема? Гэта ў першую чаргу звязана з тым, што міжнародныя фінансавыя арганізацыі патрабуюць ад нашай краіны адмаўляцца ад дырэктыўнага крэдытавання. Гэта датычыцца не толькі жыллёвага будаўніцтва, але і патокаў сродкаў, якія накіроўваюцца на розныя праекты. Напрыклад, мэтавага льготнага фінансавання арганізацый сельскай гаспадаркі, прадпрыемстваў прамысловасці, арганізацый культуры, транспарту і г. д.

Згодна з новай схемай праз пэўны час усе банкі пачнуць функцыянаваць у аднолькавых умовах і станауць прапаноўваць кліентам толькі крэдыты на рынкавых умовах з выкарыстаннем уласных сродкаў. А вось дзяржава праз пэўны механізм адраснай падтрымкі будзе дапамагаць гасіць гэты крэдыт непасрэдна Іванову ці Сідараву. У гэтым выпадку чалавек атрымае выбар: у які банк яму лепш звяртацца па крэдыт. А пойдзе чалавек хутчэй у тую фінансавую ўстанову, якая прапануе яму больш спрыяльныя ўмовы па крэдыце і яго абслугоўванні (на які тэрмін, пад які працэнт, колькі паручыцеляў, якія даведкі і іншыя нюансы). Тут усё залежыць ад канкрэтнай палітыкі камерцыйных банкаў, бо кліент будзе звяртаць увагу не толькі на памер і імідж установы, але і на іншыя яе характарыстыкі. Менавіта такія рынкавыя ўмовы паспрыяюць павышэнню канкурэнцыі ў банкаўскай сферы, упэўнены міжнародныя спецыялісты.

> **У новай схеме выдачы крэдытаў прадугледжваецца іншая крыніца фінансавання. Гэта будуць ужо не бюджэтныя сродкі, а грошы камерцыйных банкаў, іх зваротныя рэсурсы. А дзяржаўная дапамога (льгота) будзе давацца непасрэдна чаргавіку, а не пэўнаму сістэмнаму банку. Менавіта дзяржаўныя грошы будуць дапамагаць сем'ям кампенсаваць (цалкам ці часткова) працэнты і асноўны доўг па атрыманых крэдытах.**

***— А яшчэ ўсіх чаргавікоў турбуе будучы кошт будаўніцтва. Як моцна могуць змяніцца цэны?***

— Магу адзначыць, што на працягу мінулага года ў будаўніцтве назіралася павышэнне эфектыўнасці выкарыстання бюджэтных сродкаў. І гэта не проста словы, бо цэны на будаўніцтва сур'ёзна стрымліваліся. Прааналізуем сітуацыю на прыкладзе цаны квадратнага метра. Калі ў пачатку мінулага года мы мелі цану «квадрата» больш за 800 рублёў, то сярэдняя цана квадратнага метра па годзе атрымалася 765 рублёў. Гэта для тых, хто будаваў з дзяржпадтрымкай. Заўважу, што ўрадам міністэрству была пастаўлена задача — не выйсці за мяжу ў 840 рублёў за метр. У нас атрымалася танней, таму і на 2017 год запланавалі невялікую дынаміку росту цаны на жыллёвы «квадрат». Цяпер мы лічым, што рост цаны квадратнага метра магчымы толькі ў сувязі з павелічэннем індэкса будаўніча-мантажных работ (БМР), якія запланаваны на 2017 год у памеры 110,1%.

***— Атрымліваецца, што сёлета жыллё для чаргавікоў будзе даражэе прыкладна на 10 %?***

— Не зусім так. 10% — гэта максімальная мяжа росту, а на справе фактычнае павелічэнне індэкса БМР заўсёды было ніжэй планавага паказчыка.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

**Больш падрабязна на www.zviazda.by.**

## НА СУВЯЗІ КОЖНУЮ СУБОТУ

Ва ўсіх рэгіёнах краіны працягваюць работу прамыя тэлефонныя лініі

**Разбірацца ў камунальных, жыллёвых, дарожных і іншых набалелых пытаннях 25 лютага будуць прадстаўнікі абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, а таксама кіраўнікі спраў. Патэлефанаваць чыноўнікам можна з 9 раніцы да 12 гадзін. Нагадаем, «гарачыя» лініі працуюць кожную суботу.**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні ВЯЛІЧКА Алег Іванавіч (80162213121);
**Віцебскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў СЫСОЕЎ Аляксандр Уладзіміравіч (80212222222);
**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);
**Гродзенскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644);
**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні КУНЦЭВІЧ Андрэй Міхайлавіч (80222501869);
**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні СІРЭНКА Віктар Іванавіч (80175004160);
**Мінскі гарвыканкам**
кіраўнік спраў МАЦЕЛЬСКАЯ Ганна Мар'янаўна (80172224444).

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ЗША ўведзены больш жорсткія правілы па дэпартацыі незаконных мігрантаў

Такім чынам улады краіны спадзяюцца павялічыць колькасць дэпартаваных парушальнікаў. У першую чаргу новыя меры датычацца нелегальных мігрантаў, якія былі асуджаны за здзяйсненне злачынстваў або ўяўляюць пагрозу для бяспекі ў краіне, а таксама на тых, хто нядаўна трапіў на тэрыторыю Злучаных Штатаў. У дакуменце, апублікаваным міністэрствам нацыянальнай бяспекі ЗША, прыведзены шырокі спіс катэгорый мігрантаў, якія падлягаюць дэпартацыі.

### Імпарт і экспарт узбраенняў у свеце дасягнулі самых высокіх паказчыкаў з часоў «халоднай вайны»



Такія звесткі прыводзіць у сваім штогадовым дакладзе Стакгольмскі інстытут даследавання праблем міру (SIPRI), які займаецца пытаннямі разбраення і кантролю над узбраеннем. SIPRI лічыць, што актывізацыя гандлю зброяй абумоўлена ўзрослым попытам на Блізкім Усходзе і ў Азіі.

13% усяго сусветнага імпарту ўзбраенняў прыпадае на долю Індыі. Пры гэтым 70% зброі гэтая краіна імпартуе з Расіі. Іншыя буйныя партнёры індыйцаў — ЗША (12%) і Ізраіль (7%). Кітай, хоць і застаецца адным з найбуйнейшых імпарцёраў, апошнім часам скарациў аб'ёмы ўвазнога арсенала, паступова замяшчаючы яго прадукцыяй уласнай абароннай прамысловасці.

### У Маскве рыхтуюцца да масавага зносу «хрушчовак»

Мэр Масквы Сяргей Сабянін даручыў падрыхтаваць стартавыя пляцоўкі для будаўніцтва шматкватэрных дамоў у рамках новай праграмы зносу старых пяціпавярховак. Пра гэта мэр паведаміў у сваім мікраблогу ў сетцы Twitter. Раней прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін даручыў Сяргею Сабяніну знесці ўсе так званыя хрушчоўкі ў Маскве, і на іх месцы пабудаваць новыя дамы. Сабянін адзначыў, што сталіца мае неабходныя фінансавыя магчымасці для рэалізацыі гэтага праекта. Паводле папярэдніх ацэнак, гаворка ідзе аб зносе 25 млн кв. метраў жылля або 7,5 тыс. дамоў, у якіх жывуць каля 1,6 млн чалавек.

### У Паўднёвай Карэі да 2030 года працягласць жыцця жанчын перавысіць 90 гадоў



Аб гэтым сведчыць даследаванне навукоўцаў з Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і Імперскага каледжа ў Лондане, апублікаванае ў медыцынскім часопісе Lancet. У Японіі, Францыі, Іспаніі і Швейцарыі сярэдняя працягласць жыцця жанчын дасягне 88 гадоў. Мужчыны будуць даўжэй за ўсё жыць у Паўднёвай Карэі, Аўстраліі і Швейцарыі. Згодна з прагнозам навукоўцаў, сярэдняя чаканая працягласць жыцця тут складзе 84 гады. Адзін з аўтараў даследавання Маджыд Эззаці спрагназаваў, што з часам сярэдняя працягласць жыцця можа дасягнуць 110—120 гадоў.

■ Працоўны семестр

## Зарабіць і пасябраваць — у студатрадзе

**БРСМ даў старт праекту «Выбіраем студатрад!», падчас якога штабы працоўных спраў саюза моладзі ва ўстановах адукацыі краіны дапамогуць хлопцам і дзяўчатам знайсці работу на лета.**

— Сёлета я ўпершыню запісваюся ў студатрад, — дзеліцца **першакурснік спецыяльнасці «Сістэмы радыёсувязі, радыёвяшчання і тэлебачання» Валерый ШКВАРКО** ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі. — Не хочацца бессэнсоўна праводзіць час летам, і запіс у працоўнай кніжцы не будзе лішнім. Ды і грошы не на апошнім месцы, хочацца нарэшце нешта набыць за свае «кроўныя». Запоўніў анкету на аператара-паштальёна ў Белпошце. Хутчэй за ўсё, буду працаваць у аддзяленні: прымаць пасылкі ў кліентаў, вырашаць пытанні па тэлефоне. Гэта мой профіль, таму магчымасць бліжэй пазнаць прафесію — яшчэ адна перавага. Акрамя гэтага, спадзяюся завесці цікавыя знаёмствы, бо студатрад — гэта не толькі работа.

Паводле слоў **сакратара пярвічнай арганізацыі БРСМ акадэміі сувязі Алены РУМЯНЦАВАЙ**, у гэтай установе адукацыі студэнтаў традыцыйна накіроўваюць на профільныя прадпрыемствы: «Белтэлекам», Белпошту, «Белсувязьбуд» і іншыя. Найбольш распаўсюджаныя вакансіі — падсобны рабочы, паштальён, кур'ер, аператар сувязі. Акрамя таго, многія ўладкоўваюцца на работу ў прыёмную камісію акадэміі. Летась установа адукацыі дапамагла працаўладкавацца 250 студэнтам, па прагнозах сёлета лічба не будзе меншай.

— Для мяне галоўны матыў пайсці летам працаваць — гэта грошы, — прызнаецца **першакурсніца факультэта электрасувязі Кацярына КАЖАМЯКА.** — Трэба плаціць за інтэрнат, набыць рэчы на наступны навучальны год, ды і на адпачынак грошы трэба. Уладкавалася ў прыёмную камісію, працаваць буду з сярэдзіны ліпеня да пачатку жніўня. Абяцаюць заробак ад 200 рублёў, мяне гэта задавальняе.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by* ■